*М. М. Шчэрбін*
*УА МДПУ імя І. П. Шамякіна (г. Мазыр)*

# ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ЯК ЗМЯСТОЎНЫ ПАДМУРАК ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ

Сучасная вышэйшая школа павінна вырашаць жыццёва важныя задачы рэалізацыі каштоўнасных асноў адукацыі, адной з якіх з'яўляецца грамадзянска-патрыятычнае выхаванне студэнтаў. Прыярытэтнасць гэтага накірунку выхавання вызначаецца яго важнай роляй у фарміравнні дзейсных сацыяльна-маральных якасцей асобы: актыўнасці, адказнасці, абавязку; а моцны кансалідуючы пачатак і рашучая сіла патрыятызму – лепшы фактар згуртавання грамадства, які зацвердзіў сябе гістарычна. Як справядліва зазначае В. В. Буткевіч, менавіта ў студэнцкія гады адбываецца "інтэнсіўнае грамадзянскае развіццё асобы, выпрацоўваецца ўласная грамадзянская пазіцыя, перакананні, ідэалы, фарміруюцца грамадзянскія каштоўнасці" [1, с. 124]. Эфектыўнасць грамадзянска-патрыятычнага выхавання студэнтаў будзе залежаць ад шэрагу фактараў і ўмоў. Пры гэтым, на наш погляд, апора на педагагічны вопыт нашага народа, здабыткі духоўнай культуры папярэдніх гістарычных эпох – змястоўная крыніца пошуку найбольш мэтазгодных асноў сучаснага грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Патрыятызм, як пачуццё нацыянальна-арыентуючае, мае шэраг этнагістарычных прыкмет-асаблівасцей, што склаліся паступова і вызначалі якасці і адносіны чалавека да сябе, людзей і грамадства. Улік гэтых асаблівасцей дазволіць умацаваць змястоўны бок сучаснага



ПУ ім. І.П. Шамякі

грамадзянска-патрыятычнага выхавання студэнцтва, зрабіць яго больш выніковым.

Адно з першых месц у сістэме каштоўнасцей беларуса традыцыйна займалі гарманічныя адносіны з наваколлем. Замілаванне прыродай, настальгія па родных мясцінах і краявідах, пачуццёвае стаўленне да нематэрыяльных аб’ектаў (хаты, роднага парога, двара і г.д.) сфарміравалі адметную асаблівасць беларускага патрыятызму – *лірычнасць.* Цесная сувязь з прыродай, насіўшая жыццёванеабходную патрэбу ў першабытныя часы, працягвалася ў светаўспрыманні беларусаў і надалей. Гэта было звязана з вялікай залежнасцю чалавека ад прыродных з’яў, у асноўным у земляробчай дзейнасці, што садзйнічала наладжванню “роўных” адносін з усім навокал, калі чалавек успрымаўся часткай агульнага кругазвароту прыроды [4, с. 264]. Таму пачуццёвая прывязанасць да родных мясцін, замілаванне прыгажосцю і хараством таго, што побач, стварэнне прыроднаадпаведнага культурнага ландшафту – праяўленне патрыятычных якасцей чалавека.

Працягам адзначанай асаблівасці можна назваць *сакральнасць у адносінах да прыроды.* Пацвярджэннем гэтаму з’яўляюцца існаваўшыя доўгі час побач з хрысціянствам элементы старажытных вераванняў. Так, напрыклад фетышызм, татэмізм заснаваныя на абагаўленні прадметаў (камянёў, дрэў і г. д.), жывёл або раслін, доўгі час былі вядомыя на беларускіх землях. Цудадзейная сіла такіх фетышаў або татэмаў падтрымлівалася шматлікімі паданнямі і казкамі. Лячэнне хвароб і сурокаў, дапамогу ў цяжкіх справах і нават сілу надавалі валуны-асілкі, магутныя дрэвы-волаты або татэмныя жывёлы. Сімвалічныя ахвяры і падарункі сёння забытыя, але старажытны прынцып “не нашкодзь” у адносінах да ўсяго наваколля і сёння мае вялікі сэнс і нават глабальнае значэнне. А імкненне да захавання і памнажэння прыродных, нацыянальных багаццяў, беражлівасць да прыроды, зямлі і ўсяго жывога, іх рацыянальнае выкарыстанне ў сучасных умовах – і ёсць сапраўдны патрыятызм.

Адным з найстаражытнейшых праяўленняў патрыятычных пачуццяў у нашых продкаў была вялікая павага да роднай зямлі. *Архетып зямлі* праяўляўся праз цэлы комплекс адносін. Так зямля ўспрымалася як усеагульная маці-карміліца: *“Зямля корміць людзей, як маці дзяцей”*, – зазначала народная прыказка [2, с. 231]. Зямля як месца нараджэння і пахавання продкаў падтрымлівала цесную сувязь з родам, сям’ёй, як сімвал чысціні і святасці, дапамагала ў цяжкіх абставінах. Земляробства як асноўны занятак беларусаў было крыніцай жыцця, дабрабыту і сродкам выхавання лепшых чалавечых якасцей. Менавіта земляробчая праца надзялялася высокім маральным статусам: *“Хто сее хлеб, той сее праўду”*, – лічылі ў народзе [2, с. 562]. Патрыятызм па-сялянску – гэта маральнае стаўленне да сваёй зямлі, якое выражалася ў плённай працы на ёй і ў



ПУ им. И.П.Шамяки

асаблівай сялянскай любові і шанаванні яе як асновы жыцця. У сувязі з гэтым працавітасць, дбайнасць, гаспадарлівасць заўжды былі традыцыйнымі якасцямі маральнага чалавека, а лянота ці абыякавасць расцэньваліся як цяжкі грэх. "*Не той харош, хто тварам прыгож, а той харош, хто на справу гож*", – пацвярджала народная мудрасць [2, с.388]. Таму руплiва працаваць на зямлі, шанаваць і аберагаць яе – вось асноўныя паказчыкі патрыятызму, так як зямля – гэта Радзіма, "*якую не купляюць і не прадаюць*" [2].

Наступную асаблівасць беларускага патрыятызму, вядомую з даўніх часоў, абумовіла жыццядзейнасць у моцнай сялянскай абшчыне. Шматлікія сумесныя работы (талокі, сябрыны і г.д.), агульны характар вядзення гаспадаркі, прынцып вясковай узаемадапамогі ў любых жыццёвых сітуацыях прывялі да замацавання *калектывізму* як каштоўнасці, скіраванай на гарманізацыю інтарэсаў асобы, калектыву і грамадства ў цэлым. "*Моцны статак чарадою, а людзі – грамадою*", – пацвярджала народная прыказка [2, с. 325]. Такі сялянскі калектывізм прадугледжваў не толькі падтрымку кожнага канкрэтнага члена абшчыны, але быў і значным кансалідуючым фактарам, заснаваным на агульнасці. Агульнасць форм жыццядзейнасці, месца пражывання, інтарэсаў, звычаяў і г.д. прывяла да неабходнасці падтрымкі такога адзінства як асновы жыцця яшчэ са старажытных часоў. Патрыятычная сутнасць калектывізму была звязана з абаронай усяго "свайго" як часткі агульнага. І нават саслоўная раз'яднанасць перыяду феадалізму не прывяла да грамадскага расколу. Так як для чалавека сярэднявечча адпаведнасць пэўнаму месцу згодна грамадскай іерархіі, замацаванасць абавязкаў і заняткаў былі значна вышэй за асабістую значнасць. Акрамя таго, калектывізм засноўваўся на ідэі "усеагульнага дабра", атрымаўшай асаблівае распаўсюджванне з прыняццем хрысціянства. Маральнае ўдасканаленне чалавека разумелася як падстава агульнага шчасця і карысці для грамадства і не ўяўлялася індывідуальна.

Чалавечае адзінства валодае моцнай сілай, а калі яно аб'яднана агульнай мэтай – яму няма перашкод. Вось чаму найвышэйшыя ўздымы патрыятычных пачуццяў заўсёды звязаны з выключнымі абставінамі: абаронай краіны, выгнаннем непрыяцеля, стварэннем, аднаўленнем і г.д., – калі, толькі дзякуючы пасільнаму ўкладу кожнага, магчыма дасягнуць жаданага. Прыналежнасць да пэўнага кола, супольнасці або нацыі – гэта важны кансалідуючы грамадскі фактар, прыкмета развітай нацыянальнай самасвядомасці, стрыжнем якой з'яўляецца патрыятызм.

Магутным штуршком развіцця патрыятычных пачуццяў стала распаўсюджванне хрысціянства. Побач з іншымі агульначалавечымі якасцямі служэнне сваёй зямной Айчыне прызнавалася адной з найважнейшых дабрачынннасцей і рысай маральнасці асобы. Актыўная грамадская дзейнасць, вайсковая служба, абарона дзяржаўных інтарэсаў



МДПУ ім. І.П. Шамякіна

прызнаваліся царквой служэннем грамадству, краіне, Богу. Самаахвярная дзейнасць Хрыста дзеля агульнай карысці знайшла водгук на ўсходнеславянскіх землях і была вельмі папулярна як рэалізацыя галоўнага хрысціянскага пастулата – любові да бліжняга. Гісторыя ўтрымлівала шмат прыкладаў паўтарэння такога хрысціянскага подзвігу: лёс святых князёў-пакутнікаў Барыса і Глеба, асветніцкі подзвіг Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага, воінскі подзвіг Даўмонта Пскоўскага, Уладзіміра Полацкага, Аляксандра Неўскага і інш. *Хрысціянскі падмурак патрыятызму* – адна з асаблівасцей усходнеславянскага светаўспрымання, скіраванага на рэалізацыю сацыяльнай справядлівасці і роўнасці ўсіх людзей перад Богам, незалежна ад іх грамадскага становішча. Гераізм і самаахвярнасць суседнічалі з чалавекалюбствам, міласэрнасцю, клопатам і не ўтрымлівалі *нянавісці або пачуцця перавагі* над іншымі людзьмі, што стала адметнай ментальнай рысай беларусаў. А гэта ў сваю чаргу садзейнічала фарміраванню талерантнасці, разумення неабходнасці мірнага суіснавання людзей, будаванню адносін на прынцыпах дыялогу і супрацоўніцтва, што не менш актуальна і сёння.

У гэтай сувязі заканамернай з'яўляецца *маральная аснова патрыятызму*, калі нацыянальная прывязанасць абапіраецца не толькі на абавязак, але і на сістэму вышэйшых каштоўнасцей. Патрыятызм як маральная якасць асобы вызначае асновы рэгулявання дзеянняў чалавека адносна іншых людзей, народаў, краін. Уменне паставіць на першае месца не асабістыя або нацыянальныя інтарэсы і мэты, а арыентавацца на ўсеагульнае дабро – рыса не толькі хрысціянскай, але і патрыятычна-арыентаванай асобы. Спачуванне няшчасцям, гасціннасць, павага да іншых поглядаў і думак – тое, што вызначала беларусаў як у ваенныя ліхалецці, так і ў мірны час. Таму, што сапраўдны патрыятызм заснаваны на хісткім балансе паміж "асабістым-агульным", "сваім-чужым", "мужнасцю-міласэрнасцю", "рашучасцю-чалавечнасцю". Усведамленне адказнасці, павага да мінулага, гонар за сучаснае і хваляванне за будучае – тое, што павінна вызначаць жыццёвую пазіцыю сапраўднага чалавека і грамадзяніна.

Не менш уплывовае значэнне на развіццё патрыятычных пачуццяў мелі асаблівасці станаўлення дзяржаўна-прававой сістэмы на беларускіх землях. Акрамя моцнай інтэграцыйнай функцыі фарміраванне этнічнай тэрыторыі пад уладай адзінага гаспадара спрыяла з'яўленню адміністрацыйнага апарату, адпаведных дзяржаўных і прававых інстытутаў. Такое дзяржаўнае будаўніцтва не насіла выключна прымусовага характару і засноўвалася на прынцыпе "старыны не рухаць", што вызначыла прыхільнасць людзей. Таму пастуова яднанне "зверху" перарастала ў аб'яднанне ў межах адной дзяржавы, дзе ў якасці ідэалагічнай асновы выкарыстоўвалася хрысціянская вера і традыцыя.

Рэпазіторый ГДУ імя Ф. Скарыны

Знешняя пагроза паскорыла працэс кансалідацыі грамадства, а развіццё прававой сістэмы замацавала новыя формы жыццядзейнасці і ўзаемаадносін паміж людзьмі. У выніку лакальны патрыятызм перыяду феадальнай раздробленасці перарастаў у дзяржаўны, грамадзянскі патрыятызм [3, с. 137]. Менавіта для яго характэрны высокая ступень грамадзянскай адказнасці і актыўнасці, значны ўзровень развіцця нацыянальнай самасвядомасці, што, безумоўна, запатрабавана і ў сучасным грамадстве. Таму ў якасці асаблівасці патрыятызму можна назваць тую акалічнасць, што *патрыятычнае яднанне беларусаў складвалася і працякала ў формах дзяржавы і права*. Калі менавіта ўладныя структуры выступалі ў якасці асновы і гаранта стабільнасці грамадства і, у сваю чаргу, патрабавалі ад сваіх грамадзян актыўных дзеянняў у адказ: зацікаўленасці ў лёсе краіны, адстойванні інтарэсаў, абароне межаў – усяго таго, з чаго складваецца сапраўдны патрыятызм.

Разгледжаныя этнакультурныя асаблівасці з'яўляюцца складовымі элементамі этапаў-накірункаў патрыятызму:

1. *Народны патрыятызм*, які заснаваны на традыцыйнай прывязанасці да ўсяго "свайго", абапіраецца на лірычнасць, сакральнасць у адносінах да прыроды, калектывізм, архетып зямлі.

2. *Рэлігійна-гуманістычны патрыятызм*, скіраваны на гарманізацыю інтарэсаў асобы і іншых людзей, уключае хрысціянскі падмурак, адсутнасць нянавісці і перавагі над іншымі, маральную аснову.

3. *Дзяржаўна-грамадзянскі патрыятызм* прадугледжвае ідэалагічную кансалідацыю ў межах сваёй краіны, калі патрыятычнае яднанне адбываецца ў формах дзяржавы і права і падтрымліваецца імі.

Вышэйназваныя этапы-накірункі могуць раскрывацца з дапамогай наступных форм работы са студэнтамі:

| № п/п | Этап-накірунак патрыятызму | Этнасацыяльныя асаблівасці | Формы работы са студэнтамі |
|---|---|---|---|
| 1. | *Народны патрыятызм*, заснаваны на традыцыйнай прывязанасці да ўсяго «свайго». | • лірычнасць,<br>• сакральныя адносіны да прыроды<br>• калектывізм<br>• архетып зямлі | ПАЗНАВАЛЬНЫЯ:<br>✓ збор і вывучэнне фальклору;<br>✓ краязнаўчыя экскурсіі;<br>✓ арганізацыя сустрэч з цікавымі людзьмі;<br>✓ наведванне музеяў. |
| 2. | *Рэлігійна-гуманістычны патрыятызм*, скіраваны на гарманізацыю інтарэсаў асобы і іншых людзей. | • хрысціянскі падмурак,<br>• адсутнасць нянавісці і перавагі,<br>• маральная аснова | ТВОРЧЫЯ;<br>✓ інтэрпрэтацыя народных гульняў, святаў, вечарын;<br>✓ творчыя выставы;<br>✓ правядзенне студэнцкіх фестываляў;<br>✓ стварэнне творчых ансамбляў. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 3. | <u>*Дзяржаўна-грамадзянскі патрыятызм,*</u> які прадугледжвае ідэалагічнае яднанне ў межах сваёй краіны. | • патрыятычнае яднанне беларусаў складвалася і працякала ў формах дзяржавы і права | ДАСЛЕДЧЫЯ:<br>✓ правядзенне круглых сталоў, дыспутаў;<br>✓ стварэнне студэнцкіх гурткоў, клубаў;<br>✓ падрыхтоўка даследчых праектаў;<br>✓ арганізацыя студэнцкіх канферэнцый. |

Такім чынам, этнакультурныя асаблівасці народа з'яўляюцца адным з важных складнікаў арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання студэнцтва. Зварот да гістарычнай этнасацыяльнай спадчыны дазволіць удакладніць разуменне сутнасці грамадзянска-патрыятычнага выхавання, дапаможа глыбей і грунтоўней асэнсаваць напрамкі вырашэння сучасных праблем, узбагаціць формы і метады, надасць гэтаму працэсу сістэмны характар. Тым больш, што гістарычна апраўданымі заўсёды з'яўляюцца тыя інавацыі, якія маюць глыбокія карані і этнічную адпаведнасць, асабліва ў выхаванні.

**Літаратура**

1. Буткевич, В.В. Гражданское воспитание детей и учащейся молодёжи: пособие для руководителей учреждений образования, педагогов, классных руководителей и студентов / В.В. Буткевич. – Минск: НИО, 2007. – 280 с.

2. Лепешаў, І.Я. Тлумачальны слоўнік прыказак / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Гродна: ГрДУ, 2011. – 695с.

3. Старостенко, В.В. Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X–XVII вв.) / В.В. Старостенко. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2001. – 200 с.

4. Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 400 с.